# ВЫВУЧЭННЕ ЗНЕШНЯЙ ПАЛІТЫКІ СССР І МІЖНАРОДНЫХ АДНОСІН ПАСЛЯ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

**І. І. БАГДАНОВІЧ,**
**кандыдат педагагічных навук**

Імперыялістычная прапаганда імкнецца сказіць сэнс і змест знешнепалітычнай дзейнасці КПСС і Савецкай дзяржавы, пасеяць у савецкіх людзей сумненне ў правільнасці палітыкі нашай краіны, ускласці на Савецкі Саюз адказнасць за абвастрэнне міжнароднай напружанасці, раскручванне новага вітка гонкі ўзбраенняў. У сувязі з гэтым важна вызначыць, як пры вывучэнні матэрыялу пра знешнюю палітыку СССР фарміраваць у вучняў класавы, партыйны падыход да аналізу падзей і з'яў сучаснага міжнароднага жыцця, выпрацоўваць здольнасць процістаяць буржуазнай прапагандзе, пераканаўча доказваць яе лжывасць.

У дадзеным артыкуле зроблена спроба прааналізаваць матэрыял у структурна-функцыянальным плане. Гэта дапаможа настаўніку з патоку гістарычных звестак вылучыць асноўныя, правільна вызначыць навучальна-выхаваўчыя задачы, адабраць найлепшыя прыёмы і сродкі вывучэння.

Знешняя палітыка — складаная грамадская з'ява. Яна цесна звязана з іншымі сферамі жыцця — эканомікай, унутранай палітыкай, ідэалогіяй. Разам з тым вучэбны матэрыял пра гісторыю знешняй палітыкі валодае пэўнай спецыфікай. Тут утрымліваецца вялікая колькасць такіх фактаў, як дагаворы, войны, перагаворы і г. д., якія часам трэба засвоіць у неразгорнутай, агульнай форме. У структуры тэарэтычнага матэрыялу значнае месца адводзіцца светапоглядным ідэям, прычынна-выніковым сувязям, тэарэтычным вывадам і абагульненням, што дапамагае вучням арыентавацца ў падзеях і з'явах міжнароднага жыцця, даваць ім навуковую, марксісцка-ленінскую ацэнку.

Навучальныя праграмы прадугледжваюць вывучэнне наступных галоўных падзей і з'яў па гісторыі знешняй палітыкі СССР і міжнародных адносін пасля другой сусветнай вайны:

1. Утварэнне Савета Эканамічнай Узаемадапамогі і Варшаўскага Дагавора, якія з'яўляюцца часткамі больш складанай з'явы — фарміравання новага тыпу міжнародных адносін, заснаваных на прынцыпе сацыялістычнага інтэрнацыяналізму.

2. Прыняцце «дактрыны Трумэна» і «плана Маршала», стварэнне агрэсіўнага ваеннага блока НАТО. На аснове звестак аб іх вучні высвятляюць сутнасць развязанай імперыялістамі «халоднай вайны» супраць сусветнай сістэмы сацыялізму і рэвалюцыйнага руху.

3. Дапамога СССР карэйскаму і в'етнамскаму народам (1946—1954 гг.), народам арабскіх краін (1956—1958 гг.) у іх барацьбе супраць імперыялістычнай агрэсіі; венгерскаму народу ў ліквідацыі контррэвалюцыйнага мяцяжу. Вывучэнне гэтых падзей дазваляе раскрыць інтэрнацыянальную сутнасць знешняй палітыкі Савецкай дзяржавы, паказаць, што наша краіна, краіны ўсёй сацыялістычнай садружнасці — надзейныя саюзнікі ў барацьбе за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне.

4. Скарачэнне Савецкім Саюзам у аднабаковым парадку колькасці сваіх узброеных сіл і ўзбраенняў і спыненне выпрабаванняў ядзернай зброі (1956—1958 гг.). Такія факты прадэманстравалі міралюбівы характар знешняй палітыкі нашай дзяржавы, імкненне СССР да спынення гонкі ўзбраенняў і пераходу да раззбраення. Яны паказалі сапраўдныя мэты імперыялістаў, іх імкненне да нарошчвання гонкі ўзбраенняў, якая тоіць у сабе небяспеку новай сусветнай тэрмаядзернай вайны.

5. Падпісанне Маскоўскага дагавора аб частковай забароне выпрабаванняў (1963 г.) і нераспаўсюджванні (1968 г.) ядзернай зброі, дагавораў паміж СССР і ФРГ (1970 г.); ПНР, ЧССР, ГДР і ФРГ (1970—1972 гг.), пагаднення ОСВ-1 паміж СССР і ЗША (1974 г.). Пералічаныя падзеі мелі выключна важнае значэнне для аздараўлення міжнародных

адносін. Яны сведчылі аб тым, што ўпартая і паслядоўная барацьба СССР, сацыялістычных краін за мір прынесла першыя станоўчыя вынікі ў галіне паслаблення напружанасці і абмежавання гонкі ўзбраенняў.

6. Падпісанне Заключнага акта агульнаеўрапейскай Нарады па бяспецы і супрацоўніцтву (1975 г.). Гэта падзея мае сусветна-гістарычнае значэнне. Кіраўнікі 35 дзяржаў паставілі свае подпісы пад дакументам, які абвясціў, што дзяржавы — удзельнікі нарады будуць узаемадзейнічаць на аснове прынцыпаў мірнага суіснавання. Падпісанне Заключнага акта з'явілася трыумфам ленінскай знешняй палітыкі СССР.

7. Дапамога чэхаславацкаму народу ў барацьбе з контррэвалюцыяй, в'етнамскаму народу — супраць амерыканскага імперыялізму і кітайскага гегеманізму, народу Афганістана ў яго змаганні са знешняй агрэсіяй. Пералічаныя факты маюць важнае значэнне для ўсведамлення інтэрнацыянальнай сутнасці сацыялістычнай знешняй палітыкі, выхавання пачуццяў патрыятызму і пралетарскага інтэрнацыяналізму.

8. Прынццце XXIV з'ездам Праграмы міру і яе развіццё ў рашэннях XXV і XXVI з'ездаў КПСС. Засваенне сутнасці і рэалізацыя вынікаў Праграмы міру дазваляе раскрыць паслядоўнасць, пераемнасць і рэзультатыўнасць знешнепалітычнага курсу КПСС і Савецкай дзяржавы, вернасць нашай партыі ленінскім прынцыпам знешняй палітыкі.

9. Абавязацельства СССР не прымяняць ядзернай зброі першымі, ініцыятывы па прадухіленню новага вітка гонкі ўзбраенняў, пачатак якому быў пакладзены размяшчэннем Злучанымі Штатамі ракет сярэдняга радыуса дзеяння ў Заходняй Еўропе. Вывучэнне гэтых падзей мае важнае значэнне для разумення сутнасці як сацыялістычнай, так і імперыялістычнай знешняй палітыкі, выхавання ў школьнікаў пачуцця гордасці за нашу Радзіму і абурэння тымі, хто імкнецца вярнуць чалавецтва да часоў «халоднай вайны».

10. Паспяховае завяршэнне Мадрыдскай сустрэчы краін — удзельніц Нарады па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе. Работа Стакгольмскай канферэнцыі па пытаннях умацавання мер давер'я і ваеннай разрадкі ў Еўропе. Гэтыя факты сведчаць аб шырокай падтрымцы знешнепалітычных ініцыятыў СССР і іншых краін сацыялізму народамі заходніх дзяржаў.

Усе пералічаныя звесткі з'яўляюцца галоўнымі таму, што іх разбор і абагульненне дапамагае вучням засвоіць тэарэтычныя (абагуленыя) веды аб сутнасці, асноўных напрамках, метадах і сродках знешняй палітыкі сацыялістычных і капіталістычных дзяржаў, аб прычынна-выніковых сувязях і заканамернасцях развіцця знешнепалітычнай дзейнасці СССР, міжнародных адносін пасля другой сусветнай вайны. Іх засваенне садзейнічае фарміраванню важнейшых светапоглядных ідэй, на аснове якіх складваецца правільнае разуменне знешняй палітыкі сацыялістычнай краіны і навуковая свядомасць (патрыятычная, маральная, інтэрнацыянальная).

У знешнепалітычным матэрыяле ёсць таксама і негалоўныя факты. Яны не аказалі рашаючага ўздзеяння на развіццё міжнародных адносін, а таму могуць вывучацца ў сціслай форме. Але ведаць гэтыя факты неабходна, бо яны дапамагаюць уявіць падзею ў цэлым. Да іх можна аднесці, напрыклад, стварэнне агрэсіўных ваенных блокаў АНЗЮС, СЕАТА, СЕНТА, рэмілітарызацыю ФРГ і ўключэнне яе ў НАТО, падпісанне мірнага дагавора паміж ЗША і Японіяй, Бандунгскую канферэнцыю.

Не галоўным, але важным у адукацыйных адносінах з'яўляецца фактычны матэрыял, які адлюстроўвае асобныя бакі вывучаемых з'яў. Сюды можна аднесці картаграфічныя і статыстычныя даныя, інтэграцыйныя мерапрыемствы ў рамках СЭУ: стварэнне энергасістэм «Мір», нафтаправода «Дружба», газаправода «Саюз»; рост тавараабароту паміж краінамі сацыялізму; колькасныя паказчыкі дапамогі СССР краінам, якія сталі на шлях развіцця, і г. д.

У ходзе структурнага аналізу вучэбнага матэрыялу па гісторыі знешняй палітыкі і міжнародных адносін неабходна таксама вылучыць кампаненты тэарэтычнага зместу — паняцці рознай шырыні абагульнення:

— агульныя паняцці: знешняя палітыка, сацыялістычная знешняя палітыка, імперыялістычная знешняя палітыка;

— паняцці, што адлюстроўваюць прынцыпы, метады і сродкі знешнепалітычнай дзейнасці: пралетарскі інтэрнацыяналізм, сацыялістычны інтэрнацыяналізм, мірнае суіснаванне, палітыка «з пазіцыі сілы», палітычны шантаж, лакальная вайна;

— паняцці, што адлюстроўваюць стан міжнародных адносін на розных этапах гістарычнага развіцця: «халодная вайна», канфрантацыя, разрадка міжнароднай напружанасці.

Трэба, каб вучні засвоілі і наступ-

ныя істотныя для разумення сутнасці сучаснага міжнароднага жыцця сувязі і адносіны:

I. Знешняя палітыка дзяржавы вынікае з яе ўнутранай палітыкі.

1. Знешняя і ўнутраная палітыка капіталістычнай дзяржавы накіравана на ўмацаванне асноў капіталістычнай сістэмы, пераадоленне крызісу капіталізму. Імкненне да знешняй агрэсіі, вайна з'яўляецца сродкам захавання палітычнага панавання манапалістычнай буржуазіі.

2. Знешняя палітыка Савецкай дзяржавы абапіраецца на эканамічную і абаронную магутнасць краіны, ідэйнае адзінства народа, накіраванае на захаванне міру, што з'яўляецца важнейшым фактарам дасягнення галоўнай задачы ўнутранай палітыкі — пабудовы камунізму.

II. Узаемасувязь знешняй палітыкі і эканомікі.

1. Прага эксплуататарскіх класаў да абагачэння вызначае іх імкненне шляхам знешняй экспансіі ўзмацніць эксплуатацыю народаў, захаваць сваё эканамічнае і палітычнае панаванне над іншымі краінамі. Разам з тым агрэсіўная знешняя палітыка адваротна ўплывае на эканоміку капіталістычных краін. Значныя ваенныя расходы вядуць да росту дыспрапорцый у эканоміцы за кошт павелічэння ўдзельнай вагі галін, што забяспечваюць гонку ўзбраенняў. Гэта ў сваю чаргу выклікае рост інфляцыі і беспрацоўя, абвастрэнне сацыяльных супярэчнасцей.

2. Міралюбівая знешняя палітыка сацыялістычных дзяржаў звязана з асноўнай задачай сацыялістычнай вытворчасці — няўхільным ростам матэрыяльнага і культурнага ўзроўню жыцця працоўных. Яна садзейнічае росту эканамічнай магутнасці, забяспечвае мірныя ўмовы камуністычнага будаўніцтва.

III. Сувязь знешняй палітыкі з характарам грамадскага ладу.

Знешняя палітыка вызначаецца характарам грамадскага ладу. Шляхам агрэсіі і войн пануючыя класы імперыялістычных дзяржаў імкнуцца пераадолець народжаныя капіталізмам унутраныя і знешнія супярэчнасці. Працоўныя класы, якія стаяць на чале ўлады сацыялістычных дзяржаў, не зацікаўлены ў войнах і аб'ектыўна імкнуцца да захавання міру — найбольш важнай умовы паспяховай пабудовы камунізму.

Знешнепалітычны матэрыял валодае і выключна вялікімі выхаваўчымі магчымасцямі. Ён дазваляе:

а) фарміраваць актыўную грамадзянскую пазіцыю школьнікаў, заснаваную на марксісцка-ленінскім разуменні мэт, асноўных напрамкаў, метадаў і сродкаў ажыццяўлення знешняй палітыкі;

б) выклікаць асуджэнне агрэсіўнай знешняй палітыкі імперыялізму, нянавісць да тых, хто вызначае знешнюю палітыку імперыялістычных дзяржаў, спачуванне народам, якія падвяргаюцца агрэсіі, гатоўнасць аказаць ім пралетарскую дапамогу ў барацьбе за нацыянальнае і сацыяльнае вызваленне;

в) выхаваць пачуццё гордасці за нашу Савецкую Радзіму, якая змагаецца за ажыццяўленне самага запаветнага імкнення чалавецтва — імкнення да міру. Выклікаць адабрэнне міралюбівай знешняй палітыкі сацыялістычных дзяржаў.

Фарміраванню сацыяльнай пазіцыі і звязаных з ёю пачуццяў у адносінах да знешняй палітыкі садзейнічаюць змешчаныя ў знешнепалітычным матэрыяле светапоглядныя ідэі:

а) знешняя палітыка імперыялізму — палітыка рэакцыі і агрэсіі. Яна абумоўлена інтарэсамі пануючага ў грамадстве класа і накіравана на аслабленне пазіцый сусветнай сістэмы сацыялізму, камуністычнага, рабочага і нацыянальна-вызваленчага руху, на развязванне войн.

б) міралюбівая знешняя палітыка сацыялістычнай дзяржавы праводзіцца ў інтарэсах працоўных. Яна накіравана на забеспячэнне мірных умоў камуністычнага будаўніцтва, умацаванне адзінства і згуртаванасці сацыялістычных краін, іх дружбы і братэрства; падтрымку нацыянальна-вызваленчага руху і ўсебаковае супрацоўніцтва з маладымі дзяржавамі, якія сталі на шлях развіцця; паслядоўнае адстойванне прынцыпу мірнага суіснавання дзяржаў з розным грамадскім ладам; рашучы адпор агрэсіўным сілам імперыялізму, барацьбу за збавенне чалавецтва ад новай сусветнай вайны.

Такім чынам, структурны аналіз знешнепалітычнага матэрыялу, які вывучаецца ў курсах гісторыі ў X класе, дазваляе вызначыць асноўныя элементы яго фактычнага і тэарэтычнага зместу, іх ролю ў вырашэнні адукацыйных і выхаваўчых задач. Аднак рэалізацыя магчымасцей гэтага матэрыялу ў многім залежыць ад правільнага адбору настаўнікам метадычных прыёмаў і сродкаў вывучэння кожнага з вылучаных элементаў, ад таго, наколькі яны будуць адпавядаць пазнавальным магчымасцям пэўнага класа.